*І. І. Цыркун*

# Інавацыйная культура ў сістэме шматузроўневай падрыхтоўкі педагагічных кадраў

Падрыхтоўка педагагічных кадраў ва умовах шматузроўневай сістэмы адукацыі павінна адбывацца з улікам сучаснага стану педагагічнай практыкі, якая характарызуецца штучнай і натуральнай інтэнсіфікацыяй новаўвядзенняў. Таму будучы настаун!к (базавай школы, бакалаур, магістр) павінен быць падрыхтаваны да ажыццяўлення непасрэдных дыдактычных новаўвядзенняў, валодаць адпаведнай інавацыйнай культурай.

Папярэдні разгляд розных форм атыўнасці інаватара (даследаванне, асваенне і выкарыстанне навуковых вынікаў, укараненне вынікаў навуковых даследаванняў, распаўсюджанне прагрэсіўнага педагагічнага вопыту) не выклікаў неабходнасці ўвядзення паняцця "інавацыйная культура". Тэарэтычная каштоўнасць дадзенага паняцця заключаецца ў яго здольнсці акрэсліваць, сінтэзаваць усе напрамкі непасрэднай інавацыйнай дзейнасці і прыдаць ёй цэласны характар. Перабольшанне, давядзенне да абсалюту значэння толыо навуковага пазнання. гнастычнай дзейнасці ці каштоўнаснага ўсведамлення наватара або, насупраць, іх ігнараванне прыводзіць, як паказвалася [2-4], да аднабокіх, урэзаных уяўленняў аб дыдактычных новаўвядзеннях. У інававацыйнай культуры і ажыццяуляюцца рэальныя сувязі розных форм актыунасці інаватара. Пазіцыі "даследчыка", "праблематызатара", "праектыроўшчыка", "эксперыментатара", "метадолага". "упраўленца" і "пісьменн!ка" з'яўляюцца дыялектычна дапаўняльнымі ў сістэмным "целе" інавацыйнай культуры. У адносінах да пераўтваральнай актыўнасці інаватара яна выконвае сінергетычную функцыю перал1чальных пазіцый. Інавацыйная культура настаўніка-прадметніка і дыдактычныя новаўвядзенні могуць мець розныя мадэлі адносін. Інтэрвал абстракцы тут задаецца паміж традыцыйным спосабам (культурнай традьцыяй) стварзння і прымянення новых алементаў дыдактычнай сістэмы ці яе поўнага абнаўлення і авангардысцк!м, у большасці выпадкаў некультурным. Тады метадычная сістэма. метад навучання, метадычны прыем, якія інавіруюцца без уліку інавацыйнай культуры, нясуць на сабе элементы кан'юнктуры і зкзістэнцыяльнага самавольства. Інавацыйная культура можа з'явіцца матэрыялам і сродкам дыдактычных новаўвядзенняў, крыніцай прафесійна-метадычнага прагрэсу настаўніка. У той жа час яна вызначае граніцы дыдактычнага новаўвядзення, дзе выконвае лакалізацыйна-кантрольную функцыю. Калі гнастычная культура акцэнтуе ўвагу на атрыманне новых ведаў аб педагагічнай сучаснасці, то інавацыйная – на эфектыўным ажыццяўленні практычнай педагагічнай дзейнасці з улікам навуковых ведаў, прагрэсіўнага педагагічнага вопыту канкрэтнага настаўніка ў канкрэтных умовах, гуманітарнай састаўляючай навучаня, дзе ўзаемадзейнічаюць асобы настаўніка і вучня і тэхналагічныя параметры дыдактычных новаўвадзенняў часта "не спрацоўваюць". З'яўляючыся вытворнай ад інавацыйнай дзейнасці, інавацыйная культура выражае яе якасць, акрэслівае творчую самадзейнасць наватара. Такім чынам, інавацыйная культура ёсць супольны спосаб і прадукт інавацыйнай дзейнасці інаватара. Інавацыйная культура з'яўляецца інструментарыем інавацыйнай дзейнасці. акумулюе ў сабе рэгулятывы, якія забяспечваюць яе высокую якасць. У сувязі з тым што культурная традыцыя не можа ўключыць усяго мноства абставін, умоў, сітуацый і асабістых якасцей інаватара, у сістэме інавацыйнай культуры яе ўзаемадапаўняе яго індывідуальная інавацыйная культура. Яна, з аднаго боку, адказвае на пытанне, у якой ступені інаватар валодае і карыстаецца культурнай традыцыяй, а з другога — падкрэслівае важнасць яго асабістага фактару. У працэсе стварэння і рэалізацыі новаўвядзенняў інаватар яўна ці няяўна ўдзельнічае ў протатрадыцыі, адначасова трансфармуе свой індывідуальны вопыт у калектыўны. У агульным выглядзе ў састаў інавацыйнай культуры як сістэмы ўвайшлі: інаватар як стваральнік і прадукт інавацыйнай культуры: метадычны твор як асноўны прадукт інавацыйнай дзейнасці: сістэма сродкаў, з дапамогай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

якіх ажыццяўляецца інавацыйная дзейнасць. На ўзроўні культурнай традыцыі сродак дзейнасці з'яўляецца элементарнай адзінкай культуралагічнага аналізу.

Стварэнне сістэмнаій мадэлі інавацыйнай культуры на ўзроўні культурнай традыцыі звязана з вялікімі цяжкасцямі, якія абумоўліваюцца комплексным характарам інавацыйнай дзейнасці і адноснасцю граніц паміж яе асобнымі бакамі. Выкарыстаем для яе пабудовы прынцып узбуйнення. У гэтых умовах неабходна знайсці спецыфічнага пасрэдніка ў якасці базіснай сістэмы, якая пераўтварае далзеную сістэму ў больш буйную. Эквівалентнасць многіх функцый культуры і тэорыі, у першую чаргу іх рэгулятыўнаснь у адносінах да дзейнасці, дазваляе выбраць у якасці базіснай сістэмы тэорыю. Падкрэслім,. што змест функцый, іх аб'ём і сувязі ў культуры больш нявызначаныя. чым у тэорыі. але іх накіраванасаь і сэнс вельмі падобныя.

Улічваючы гэта, інавацыйная культура як сістэма будзе ўключаць: заснаванне, ядро, вывады і дадатак. Заснаванне, ядро і вывады заключаюць усе неабходныя сродкі для ажыццяўлення інавацыннай дзейнасці ў цэлым, а таксама інфармацыйнага забеспячэння яе асноўных сфер — метадычнага пошуку, стварэння метадычнаіі навізны, яе рэалізацыі і рэфлексіі дыдактычнага новаўвядзення. Падсістзма дадаткаў інавацыйнай культуры з'яўляецца функцыянальнай і арыентавана на далейшую канкрэтызацыю папярэдніх падсістэм культуры. Напрыклад,. у склад заснавання інавацыйнай культуры ўвайшлі элементы: тэзаўрус інавацыйнай праблематыкі; дамінуючыя аб’ектыватары інавацыйнай дзейнасці; эмперычныя факты аб метадычнай рэальасці; сукупнасць метадаў і прыёмаў, якія забяспечваюць інавацыііную актыўнасць інаватара.

Такое разуменне інавацыйнай культуры дазволіла сфармуляваць шэраг яе дадатковых функцыіі. Праз арганізацыйна-ўпарадкаваную (дыдактычную) функцыю будзе ажыццяўляцца ўвядзенне студэнта (будучага інаватара) у выяўленыя, нарматыўна адобраныя, стэрэатыпныя працэдуры інавацыйнай дзейнасці. Апісальна-тлумачальная функцыя з дапамогай сістэмы паняццяў дазволіць адэкватна выразіць сутнасць інавацыйнай праблемы, растлумачыць пераўтварэнні, якія маюць месца ў працэсе навучання, што дапаможа своечасова ўносіць карэктывы ў канкрэтны інавацыйны працэс. Выкананне прагнастычна-кіраўніцкай функцыі дасць магчымасць забяспсчыць антыцыпацыю верагодных прагрэсіўных змен у курсе навучання і кіраўніцтва імі з мэтай стварэння неабходных крытэрыяў ацэнкі і ўмоў. У працэсе ажыццяўлення эўрыстычна-пазнавальнай функцыі ў фондзе інавацыйнай культуры павялічыцца колькасць узораў і прыкладаў інавацыйнай дзейнасці, што дазволіць інаватару не толькі канцэнтраваць увагу на актуальных праблемах, але і рэфлексаваць, і абнаўляць яго. Камунікатыўна-трансляцыйная функцыя рэалізуецца Праз каапераванне калектыўнага інавацыйнага розуму інаватараў, арганізацыю перманентнага маніторынгу і абмен прадуктамі і працэдурамі інавацыйнай дзейнасці.

Інавацыйная культура, разглядаемая ў рэальнай паўнаце і цэласнасці, ёсць пераход інавацыйнай дзейнасці ў прадметнасць і прадметнасці ў інавацыйную дзейнасць, пераўтварэнне спосабу дзейнасці ў яе прадукты і наадварот. Як прадгісторыя высокага ўзроўню прафесійна-метадычнага майстэрства настаўніка-прадметніка, інавацыйная культура выкарыстоўвае яго таксама ў якасці пачатку свайго адліку. Яна павінна задавальняць патрабаванні настаўніка і грамадства ў прасторавым і часавым вымярэннях. У першым разглядзе на яе аснове выпрацоўваюцца неабходныя дыдактыка-метадычныя ўмовы, якія забяспечваюць павышэнне эфектыўнасці навучання ў дадзены момант развіцця адукацыі. Часавае вымярэнне прадугледжвае захаванне прымнажаемага настаўнікамі, наватарамі і інаватарамі вопыту, яго перадачу, а таксама бесперапыннае развіццё дыдактыкі і методык выкладання прадметаў. Інавацыйная культура выступае і як механізм "сацыяльнага наследавання" інавацыйнай дзейнасці, перадачы культурнай традыцыі, і як сродак забеспячэння актуальных патрабаванняў адукацыі. Як адно сістэмнае цэлае яна нясе на сабе адбітак культурнай традыцыі і культурагеннага суб'екта-інаватара.

ЙБГПУ

У залежнасні ад выбранага ўзроўню падрыхтоўкі псдагагічных кадраў з улікам развіваючага эфекту могуць быць адабраны адэкватны аб'ём інавацыйшай культуры, яго змест і сродкі яе станаўлення і развіцця ў будучага настаўніка.

*ЛІТАРАТУРА*


1. Ціханаў Л.М., Грымаць А.А. Сістэма шматузроўневай падрыхтоўкі педагагічных кадраў. Мн., 1993.
2. Цыркун І.І. Канцэпцыя інавацыйна-метадычнай падрыхтоўкі настаўніка фізікі// Пераемнасць у выкладанні фізікі ў сістэме бесперапыннай адукацыі. Мн., 1993. С. 14-16
3. *Цыркун И.И.* Методология дидактических нововведений // Проблемы развития науки и образования в современных условиях и укрепление международных связей ученых. Мн., 1994. *С.* 149-157.
4. *Цыркун І.І.* Спецыфіка дыдактычных новаўвядзенняў// Весці БДПУ. 1995. № 1(3).


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ